быть, она и есть, но она звучит фрагментами. Возможно, я ещё сумею её набросать». Вывод № 2 – НАДО ОРГАНИЧНЕЕ ЖИТЬ В ТЕМЕ. Пусть даже она будет похожа на нечто абсурдное, всё равно – надо целиком в неё погружаться. Надо ощущать, чувствовать, испытывать всем своим нутром жизненные проекты. С вхождением в эту органику тесно связана одна из наиболее глубоких для самого Дорошевича тем. Именно эта тема является краеугольным камнем его личной концепции. Условно её можно обозначить как неклассическое интуитивно-мистическое постижение мира собственной фантазией. Иными словами, это погружение в духовную сущность жизни посредством творческого начала. «Если это начало получило достаточное развитие в твоей жизни, то ты её прожил не зря». Вывод № 3 – НИКОГДА НЕ НАДО ПРИСПОСАБЛИВАТЬСЯ К ОБСТОЯТЕЛЬСТВАМ. Конечно, это чревато, однако не стоит ни о чём сожалеть. Надо жить так, чтобы это было достойно Человека, что, кстати, очень тяжело. Сам человек никогда себя адекватно не оценит. Смысл в том, чтобы он был адекватен своей жизни, получал от неё удовольствие и был самодостаточен. «Я, в принципе, самодостаточен. Я проходил все этапы – у меня сожаления нет. Конечно, есть упрёки к самому себе».

***Заключение.*** Биографическое исследование получилось многогранным. Интервью далось непросто – Э. Дорошевич говорил, что я беру у него практически исповедь, и все это достаточно тяжело. Не все стороны ему хотелось показывать, наблюдалось некоторое волнение оттого, что его личное пересечет некоторую грань, за которой что-то из изложенного покажется кому-то предосудительным или же не в том свете, в каком бы он хотел себя показать. Все эти опасения больше ничего не значат. Значимо другое – без данного интервью многие детали уже бы канули в лету, но теперь они оставляют яркое и живое представление в памяти, с которым не сравнится никакая официозная презентация.

*Юлія Люкевіч*

**«…КАБ ВЫНІКАМІ ДАСЛЕДАВАННЯЎ МАГЛІ КАРЫСТАЦЦА І НАВУКОЎЦЫ, І ЛЮДЗІ, ЯКІХ ЯНЫ ВЫВУЧАЛІ» (*памяці Э. К. Дарашэвіча*)**

*У артыкуле аўтар аналізуе «ініцыяцыю ў рамяство» ад Э. Дарашэвіча – аднаго з заснавальнікаў беларускай культурнай антрапалогіі (у напрамку якой дзякуючы яму, а таксама яго сябру і саратніцы З. Мажэйка, інэрцыяльна рухаецца айчынная практычная фалькларыстыка XXI ст.) – навукі, якая адваблена, цвяроза, без комплексаў і ідэалагічных «лейцаў» вывучае людзей і грамадствы, якія нас атачаюць.*

*Yulia Lyukevich*

**«... IT IS NECESSARY THAT THE RESULTS OF THE STUDY BE USED BY BOTH SCIENTISTS AND PEOPLE WHO HAVE STUDIED» *(memory of E. K. Darashevich)***

*In this article, the Master of Arts, graduate student of the NAS of Belarus Yu. Lyukevich analyzes the «initiation into the craft» of E. Darashevich, one of the founders of Belarusian cultural anthropology (in the direction of which, thanks to him, as well as his friend and colleague Z. Mazheyko, domestic practical folklore 21st century moves by inertia) – a science that is liberated, sober, without complexes and ideological «reins», studies the people and societies that surround us.*

Энгельс Канстанцінавіч быў фенаменальным выкладчыкам. Ён уразіў мяне сваёй энергічнасцю і харызмай з першай лекцыі. Прафесар востра адчуваў актуальны час, відавочна небяспечны для традыцыйнай культуры ды яе аксіялагічнай асновы, на яго думку, знітаванай з выжываннем чалавецтва ўвогуле і беларусаў як народа ў прыватнасці. Тэмы, якія мы абмяркоўвалі, былі важнымі і актуальнымі, а яго заняткі заўжды хацелася наведваць, бо прысутнічалі мы (фальклорны гурт «Вяснянка» – 2008–2013 гг. – клас дацэнта кафедры этналогіі, кандыдата педагагічных навук Наталлі Петуховай) на іх толькі з задавальненнем: вопыт і майстэрства Э. Дарашэвіча іншага варыянта нам не пакідалі. На лекцыях ён выступаў у ролі выдатнага апавядальніка і падбіраў цікавыя ілюстрацыйныя матэрыялы. Прычым з надзвычай дасведчаным і эрудыраваным прафесарам Э. Дарашэвічам нам было вельмі проста і вельмі цікава весці дыялог: студэнтаў ён не толькі *с л у х а ў*, але і *ч у ў*.



Малюнак 1 – На дыпломным праекце курса Н. Петуховай – гурта «Вяснянка». БДМНАіП, 2013



Малюнак 2 – Э. Дарашэвіч, В. Лабачэўская, В. Калацэй на дыпломным праекце. БДМНАіП, 2013

Нягледзячы на паважаны ўзрост (мы, дарэчы, заўсёды пра гэты самы яго ўзрост пад націскам яго пазітыўнасці і энергіі забываліся) прафесар з’яўляўся актыўным удзельнікам выключна ўсіх мерапрыемстваў кафедры этналогіі, звязаных з традыцыйнай культурай. Прычым быў не інертным гледачом, а актыўна прымаў удзел у дзеі, рэканструкцыі абраду, фэсце, нават у постфальклорных вячорках і танцавальных імпрэзах. Нездарма ў яго апошняй на сённяшні момант манаграфіі «Тэорыя фальклору» цэлы раздзел «Фальклор і этнаэкалогія» [1, с. 42–61] прысвечаны постфальклорнай субкультуры, якую



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ён вывучаў метадам «уключанага назірання» – знутры, пражываючы ключавыя «структуры паўсядзённасці» носьбітаў постфальклору. Гэтыя структуры: вуснае перайманне, нецэнзураванасць творчасці, карнавальнасць, ахова карэннага стылю выканання, асабісты творчы ўнёсак, паглыбленне ў традыцыю, спантаннасць творчасці, заахвочванне да сатворчасці адрасата свайго мастацтва, рэгулярны ўдзел у традыцыйных абрадах, – ён сам прааналізаваў па выніках свайго назірання [1, с. 46–47].

Я вельмі добра памятаю яго прысутнасць на рэканструкцыі заходнепалескага вяселля – маім дыпломным праекце (мал. 1–2) – у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту (БДМНАіП), а таксама стромкую падтрымку ў маім жаданні захоўваць усе нюансы аўтэнтычнай мясцовай фанэтыкі пры расшыфроўцы і эдыцыі вясельных песень з маёй радзімы – Заходняга Палесся, якія там гучалі (мал. 3). Такая прынцыповая пазіцыя Э. Дарашэвіча ўстойліва фарміравала ў нас, тагачасных студэнтаў і будучых прафесіяналаў, трывалую павагу да: а) справы, якой мы мусім займацца прафесійна – вывучэння і перайманння нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі; б) саміх скарбаў, а таксама носьбітаў народнага мастацтва нашай Радзімы, дзякуючы якім гэтыя скарбы захаваныя для чалавецтва ў XXI ст., калі большасць людзей, на жаль, занята спажываннем, а не думкамі пра будучыню сваіх дзяцей і планеты ўвогуле.






Малюнак 3 – Удзельнікі гурта «Вяснянка» ў кобрынскіх строях (БДМНАіП, 2013) і адна з песень дыпломнага праекта па заходнепалескім вяселлі. Запіс аўтара, натацыя Ж. Кляпацкай

Ён пастаянна нам тлумачыў пра гісторыка-культурную спадчыну, культурную спадчыну, нематэрыяльную культурную спадчыну, пра важнасць яе аховы, тым больш, што адзін з першых у краіне прысвяціў гэтай спадчыне манаграфію [3]. Калі ў 2009 г., дарэчы пры ўдзеле нашай кафедры ў падрыхтоўцы неабходнай дакументацыі (ад кафедры гэтым займаліся вучні Э. Дарашэвіча – В. Калацэй і В. Красулін), абрад «Калядныя Цары» цэнтральнабеларускай в. Семежава (мал. 4) уключылі ў спіс ЮНЕСКА, ён адразу стаў сардэчна віншаваць ініцыятыўную групу праекта (У. Шчаснага, А. Сташкевіч, Т. Кухаронак, Р. Гамзовіч). Э. Дарашэвіч як вопытны, прайшоўшы шматлікія жыццёвыя выпрабаванні чалавек, ведаў, што нашыя "Цары" (як і наступныя намінанты спісаў ЮНЕСКА – "Будслаўскі фэст" і "Юраўскі карагод") побач са спеўна-харэапластычнымі суфійскімі цэрэмоніямі Турцыі (мал. 5), славацкім амбушурным аэрафонам фуярай (мал. 6), мужчынскімі поліфанічнымі спевамі Грузіі (мал. 7) і іншымі з'явамі ў статусе «Masterpieces of the Oral and Intangible Heritage of Humanity» (*англ.* «шэдэўры вуснай і нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва»), акрамя павагі грамадства да носьбітаў традыцыі, гэта яшчэ і павага з боку міжнароднай супольнасці да Беларусі як суверэннай і незалежнай краіны.









Асобныя намінанты з пераліку ЮНЕСКА «Oral and Intangible Heritage of Humanity»:

Малюнак 4 – Дружына абраду «Калядныя Цары». Семежава, Беларусь, 2009

Малюнак 5 – Удзельнік суфійскіх цырымоній. Турцыя, 2005 [4, с. 90]

Малюнак 6 – Фуярыст. Славакія, 2005 [4, с. 85]

Малюнак 7 – Выканаўцы мужчынскіх поліфанічных аўтэнтычных спеваў. Грузія, 2001 [4, с. 42]

Калі ў 2013 г. гурт «Стаўбунскія вячоркі», які ўжо гадоў 10 з'ўляецца адным з апошніх захавальнікаў традыцыі ваджэння і пахавання «стралы», а таксама калядавання ды жніва на Веткаўшчыне (мал. 8), запрасіў кафедру на свой юбілей, сярод тых, хто даехаў (узімку за 360 км у халодным і «жорсткім» мікрааўтобусе) у в. Стаўбун Веткаўскага раёна з намі, вядома, не мог ня быць Э. Дарашэвіч (мал. 9).

Як чалавек, які вывучаў культуру сваёй краіны ў экспедыцыях і па архіўных дакументах, ён дакладна ведаў статус жанчын, да якіх прыехаў узімку 2013 г. «Гэтыя спявачкі рэпрэзентуюць культуру тысячадворнай вёскі і з'ўляюцца, па меркаванні мясцовых

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

жыхароў, лепшымі песенніцамі. Яны ж – асноўныя завадатары і арганізатары мясцовых каляндарных абрадаў. Майстэрскае валоданне традыцыйным рэпертуарам спалучаецца ў іх з чароўным, часам даведзеным да абсалюта, выкананнем. Выканальніцкі стыль гэтага калектыва ў яркай форме перадае культуру спеваў усходнепалескіх беларусаў», – пісалі пра стаўбунскія спеўныя гурты яшчэ ў 1980-х гг. у анатацыі да дыску «Каляндарныя песні Беларускага Палесся: Са збораў фанаграм-архіва Пушкінскага дома» савецкай фірмы грамзапісу «Мелодыя» санкт-пецярбургскія этнографы Л. Пярова і Ю. Марчанка [2, с. 11].





Малюнак 8 – Удзельніцы гурта «Стаўбунскія вячоркі», а таксама лідэр гурта С. Парашчанка на жніве. Стаўбун, 2017



Малюнак 9 – Э. Дарашэвіч (стаіць 1-шы злева) на 30-годдзі гурта «Стаўбунскія вячоркі», 2013

Энгельс Канстанцінавіч быў выключным прафесіяналам у сваёй сферы і меў глыбокія веды ў шматлікіх галінах навукі, да яго заўсёды можна было звярнуцца за парадай і рэкамендацыямі. Я вельмі ўдзячная, што мне пашчасціла атрымліваць кансультацыі і «ініцыяцыю ў рамяство» ў аднаго з заснавальнікаў беларускай культуралогіі і культурнай антрапалогіі (у напрамку якой передусім дзякуючы яму, а таксама яго каляжанцы З. Мажэйка, рухаецца айчынная практычная фалькларыстыка XXI ст.) – навукі, якая адвабленa, цвяроза, без шавіністычных і ідэялагічных «лейцаў» вывучае людзей і грамадствы, якія вакол нас.

Яго парады па арганізацыі палявой працы антраполагаў дапамаглі мне падчас збору матэрыялаў па вясельнай абраднасці майго роднага Заходняга Палесся для дыпломнай працы як выпускніцы кафедры этналогіі БДУКМ, а потым і для магістарскай ды кандыдацкай дысертацыі ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі. Ён лічыў, што менавіта палявая праца дазваляе фалькларысту атрымаць кваліфікацыю сапраўднага спецыяліста, і асаблівую ўвагу ён надаваў моманту ўзнікнення кантакту паміж даследчыкам і носьбітам культуры: «Калі няма кантакта з носьбітамі – няма якасных і навукова карысных вынікаў даследавання. Каб быць прынятымі ў асяродку людзей – аб'ектаў вывучэння, мы павіны наладзіць добрыя адносіны з імі. Даследчыкі павінны быць пільнымі пры выкарыстанні сабранай інфармацыі і сачыць, каб вынікамі даследаванняў маглі карыстацца і навукоўцы, і людзі, якіх яны вывучалі» [1, с. 28].

Разам з маімі былымі калежанкамі па курсе, якія (усе да адной) абралі кар'еру даследчыка (пасля магістратуры сталі аспірантамі НАН Беларусі) мы сардэчна ўдзячныя Э. Дарашэвічу за вельмі выніковую «фармоўку» (сапраўдную ініцыяцыю) нас у здольнасці не толькі *слухаць* і *глядзець* на носьбітаў традыцыйнай культуры, а *чуць* і *бачыць* іх (як асоб, выбітных майстроў мастацтва вуснай традыцыі, а галоўнае – гарантаў аховы спадчыны, якая ратуе і беларусаў, і чалавецтва ўвогуле ад пераўтварэння ў прымітыўных біяробатаў эпохі кансюмерызму).

**Спіс літаратуры:**


1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Энгельс Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с. : іл.
2. Калацэй, В. Лінія жыцця / Вячаслаў Калацэй // Настаўніцкая газета, 2013. – 28 лютага. – № 21. – С. 11.
3. Культурная спадчына: Культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні / Э. Дарашэвіч, Ул. Конан і інш.; уклад, нав. рэд. і аўт. прадм. – праф. Э. Дарашэвіч – Мінск : ВТАА «Сучаснае слова», 2001. – 168 с.
4. Masterpieces of the Oral and Intangible Heritage of Humanity. Proclamations 2001, 2003 and 2005 / chief editor Rieks Smeets. – Gand : Snoeck-Ducaju & Zoon. – 107 p.



***Вольга Кулікова***


**ГУМАНІСТЫЧНЫЯ АСНОВЫ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ *(памяці прафесара Э. Дарашевіча)***


*У артыкуле разглядаецца феномен гуманістычных асноў беларускай нацыянальнай культуры, на які адным з першых звярнуў увагу Э. Дарашэвіч. Сінтэз хрысціянскай духоўнасці, антычнай мастацкай міфалогіі і аўтахтоннай фальклорнай традыцыі ў XIX ст. стаў фундаментам адраджэння беларускай культуры (найперш літаратуры), а ў пач. XX ст. гуманізм мастацкай культуры Беларусі набыў новыя рысы і можа быць ахарактарызаваны як перыяд класічнага народнага гуманізму.*



***Olga Kulikova***


**HUMANISTIC FUNDAMENTALS OF THE BELARUSIAN NATIONAL CULTURE (*memory of joint work with the scientific adviser E. Darashevich*)**


*This article examines the phenomenon of humanistic foundations of the Belarusian culture, which was one of the first to draw the attention of the author's supervisor – professor E. Darashevich. According to the author, the synthesis of Christian spirituality, ancient artistic mythology and indigenous folk tradition, already in the nineteenth century. became the foundation of the revival of Belarusian culture (especially literature), and in the beginning. XX century the humanism of the artistic culture of Belarus acquires a new character, which can be characterized as a period of classical folk humanism.*





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ